# ПІЛІГРЫМКІ ГРЭКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ

У. П. Кастрыцкі

*Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт*
*імя П. В. Сухога, Беларусь*

Навуковы кіраўнік С. А. Юрыс

Тыя змены, якія адбываюцца ў сучасным беларускім грамадстве, дыктуюць і дадатковыя мэты місіянерскай дзейнасці Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы (БГКЦ). БГКЦ пачынае адраджэнне напрыканцы XX ст., як Царква з вялікай гісторыяй. Другі Ватыканскі Сабор (1962-1965 гг.) акрэслівае Каталіцкую Царкву як супольнасць партыкулярных Цэркваў, згуртаваных паміж сабой, якія застаюцца ў еднасці з Біскупам Рыму. Каталіцкая царква прысутнічае ў кожнай паасобнай Царкве гэтай супольнасці. Каталіцкая Царква, адна і адзіная, існуе ў многасці партыкулярных Цэркваў, якія захоўваюць свае асаблівасці. На сёння існуе 21 Усходняя Каталіцкая Царква і Заходняя - Лацінскі Касцел. БГКЦ тэта адна з 21 Усходніх Каталіцкіх Цэркваў. Яна -Царква свайго права, што азначае

аўтаномнасць. Цяжкі гістарычны лес прывёў да таго, што БГКЦ не мае на сённяшні дзень іерархічнай структуры. БГКЦ мае прыблізна 15 парафій, зарэгістраваных у асноўных гарадах краіны, парафіі аб'яднаны ў дэканат БГКЦ, колькасць вернікаў складае каля 3000 чалавек.

Адной з форм пашырэння ўплыву БГКЦ у сучаснасці з'яўляюцца пілігрымкі. На сучасны момант мы ведаем аб штогодніх традыцыйных і шмат іншых пілігрымках Грэка-Каталіцкай Царквы. Вось некаторыя з іх.

25-26 мая 2006 г. беларускія грэка-католікі пілігрымавалі ў Варшаву на сустрэчу з Папам Рымскім Яго Святасцю Бенядыктам XVI. З Мінска ў Варшаву выехаў аўтобус з пілігрымамі, да якіх па дарозе далучыліся таксама больш за два дзесяткі вернікаў з Берасцейшчыны. Пасля пераезду мяжы пілігрымы завіталі ў каталіцкую парафію славяна-візантыйскага абраду Велікамучаніка Мікіты, што ў Кастамлотах за Бугам, за 15 км ад Брэста, дзе захоўваюцца мошчы блаславеных уніяцкіх мучанікаў з Пратуліна. Парахам гэтай парафіі з'яўляецца марыянін Архімандрыт Раман (Пентка). Ужо ў Кастамлотах выявілася, што большасць з пілігрымаў упершыню патрапіла ў гэтую парафію. На плошчы ў Варшаве было дзве тысячы беларускіх вернікаў. Вернікі радасна віталі Першаярарха Каталіцкай Царквы разам з сотнямі тысяч іншых удзельнікаў. Сваю гамілію Бенядыкт XVI распачаў словамі Яна Паўла II: «Няхай сыйдзе Дух Твой і адновіць аблічча зямлі! Гэтай зямлі!» Пасля малітоўнай сустрэчы з яе Святасцю Папам Бенядыктам XVI беларускія грэка-каталіцкія пілігрымы заехалі ў парафію Вясела (прадмесце Варшавы), дзе ў рэкалекцыйным цэнтры іх прымалі прадстаўнікі Супольнасці «Новая Дарога» [1, с. 4].

1-2 ліпеня 2007 г. вернікі Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы па традыцыі далучыліся да ўрачыстасцяў з нагоды свята іконы Маці Божай Будслаўскай. З Мінска на свята ў Будслаў увечары ў нядзелю, 1 ліпеня, прыбыў аўтобус з грэка-каталіцкімі пілігрымамі, прыкладна ў той самы час прыехалі яшчэ два мікрааўтобусы з вернікамі з Брэста. Падчас начнога служэння Маці Божай Будслаўскай на 2-й гадзіне ночы грэка-каталіцкія святары адслужылі Боскую Літургію ў візантыйскім абрадзе. Набажэнства каля галоўнага алтара перад цудатворнай іконай Маці Божай Будслаўскай узначальваў нядаўна высвячаны беларускі грэка-каталіцкі святар Яўген Усошын. 2 ліпеня, у дзень свята ў гонар цудатворнай іконы Маці Божай Будслаўскай, на 12-й гадзіне святары і вернікі БГКЦ разам з іншымі пілігрымамі маліліся на ўрачыстай св. імшы. Наогул у Будслаўскім фэсце ў гонар Багародзіцы сёлета ўзялі ўдзел каля сарака тысячаў вернікаў [2, с. 15].

З 11 па 15 ліпеня 2007 г. адбылася XIII штогадовая Пілігрымка беларускіх грэка-католікоў. За 4 дні каля васьмі дзесяткаў пілігрымаў прайшлі шлях з Віцебска - месца мучаніцкай смерці святамучаніка Язафата - ў Полацк - месца мучаніцкай смерці Полацкіх Пакутнікаў 1705 г. Пілігрымка была адной з найважнейшых душпастырскіх ініцыятываў 2007 г., які ў БГКЦ адзначаўся як «Год веры». Таму дэвіз і тэма сёлетняй XIII-й Пілігрымкі быў такі: «Дзе вера - там і моц (св. Ян Залатавусны)». Гэтая тэма ўпісвалася ў агульную душпастырскую тэму, якую на 2007 г. вызначыла Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў Беларусі: «Усе пакліканы да святасці». Пілігрымка прайшла традыцыйным шляхам праз Слабаду, Шуміліна, Обаль, Гараны, Струнне. На сваім шляху штодзень пілігрымы маліліся. У нядзелю, 15 ліпеня, яна завершылася ў Полацку, каля сценаў грэка-каталіцкага храма св. Параскевы Полацкай.

Пілігрымкі - гэта прыклад масавых рухаў, якія надаюць магчымасць людзям зрабіць самім што-небудзь у Царкве ў імя сваей веры. Таму неабходна ствараць магчымасці для таго, каб на парафіяльным узроўні ствараліся ўмовы для актыўнай работы людзей у імя Хрыстовай веры.

Л ітаратура

1. Царква. Грэка-каталіцкая газета. - 2006. - № 2 (49).
2. Царква. Грэка-каталіцкая газета. - 2007. - № 3 (54).